**Уладзімір Касько**
**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

# РЭГІЯНАЛЬНАЯ ПЕРЫЁДЫКА БЕЛАРУСІ НА ШЛЯХУ СТАНАЎЛЕННЯ

Тэрмін "міжрэгіянальная прэса" пакуль не замацаваны ў навуковых працах па журналістыцы, не значыцца ў афіцыйнай статыстыцы. Такія газеты з'явіліся параўнаўча нядаўна, колькасць іх у Беларусі невялікая – усяго сем выданняў. Здаецца мізэр, калі ўлічыць, што ў краіне зарэгістравана звыш 900 газет, з іх 135 дзяржаўных: 118 раённых, 9 абласных, 8 гарадскіх, звыш 10 рэспубліканскіх, у тым ліку прафесіянальна-галіновых, ведамасных. І ўсё ж скідваць з рахунку міжрэгіянальную прэсу не трэба, бо яна з'яўляецца прамежкавым звяном паміж раённымі і абласнымі газетамі, распаўсюджвае свой уплыў на некалькі раёнаў.

Сур'ёзным канкурэнтам афіцыйнай "Маладзечанскай газеты" стала "Рэгіянальная газета", таксама прапісаная ў Маладзечна. Над яе загалоўкам пералічаны геаграфічныя назвы: Вілейка, Смаргонь, Ашмяны, Валожын, Мядзель, Астравец, Мінск. Такая зона ўплыву выдання, у штаце якога налічваецца ўсяго некалькі чалавек. Цікавая дэталь – газета распаўсюджваецца на тэрыторыях двух абласцей – Мінскай і Гродзенскай, якія ў шмат чым адрозніваюцца па эканамічных, сацыяльных, прыродных, культуралагічных параметрах. Розныя магчымасці ў дзяржаўнай і недзяржаўнай прэсы па атрыманню афіцыйнай інфармацыі. І запас трываласці ў дзяржаўных газетах значна вышэйшы. Яны пастаянна атрымліваюць датацыі з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, няма праблем з атрыманнем памяшканняў для работы, з распаўсюджваннем тыражоў. І тым не менш міжрэгіянальная прэса жыве. Тая ж "Рэгіянальная газета" ўвайшла ў першую дзесятку сярод рэгіянальных СМІ па тыражах, стала не толькі самаакупаемай, але нават атрымлівае значны прыбытак, які ідзе на паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы, павышэнне аплаты штатным супрацоўнікам, пазаштатным карэспандэнтам, якія прадстаўляюць інтарэсы газеты ў іншых рэгіёнах рэспублікі. Памятаючы словы У. У. Маякоўскага "сціскай эканоміяй кожны пятак", журналісты авалодваюць сумежнымі прафесіямі аператара, карэктара, менеджэра, вадзіцеля, прадаўца, паштальёна. Сёння тыраж "Рэгіянальнай газеты" перавысіў дзесяцітысячны рубеж, што ў некалькі разоў вышэй за паказчыкі многіх афіцыйных раённых выданняў.

Поспех гэтага калектыву бачыцца ў наступным:

– у эфекце самарэкламы. Падпісчыкаў, пакупнікоў спачатку зацікавіў сам факт з'яўлення такой газеты. Азнаёміўшыся з яе зместам, яны сталі лічыць яе сваёй;

– у з'яўленні магчымасці атрымліваць больш інфармацыі пра тое, што робіцца ў абласцях, суседніх раёнах. Аналіз нумароў "Рэгіянальнай газеты" за апошнія паўгода засведчыў наступнае: 46 % матэрыялаў тычыцца падзей, якія адбываюцца ў Маладзечанскім раёне, 16 % – у Вілейскім, 13 % – Смаргонскім, 9 % – Мядзельскім, 7 % – Ашмянскім, па 3 % – у Астравецкім, Валожынскім раёнах і ў Мінску;

– у магчымасці насельніцтва прымаць удзел у дыскусіях па актуальных пытаннях сацыяльнага, эканамічнага жыцця, выказаць крытыку ў адрас кіраўнікоў свайго раёна, таму што ў мясцовай газеце гэта зрабіць цяжэй;

– у павышэнні якасці публікацый, таму што патрабаванні ў новага чытача міжрэгіянальнай газеты вельмі высокія.

Праблемы, якія трэба вырашаць кіраўнікам міжрэгіянальнай прэсы, зводзяцца да наступнага:

– наладжвання добрых дзелавых кантактаў з калегамі з мясцовых газет. Трэба абменьвацца з імі інфармацыяй, вопытам работы, праводзіць сумесныя акцыі з мэтай прыцягнення да супрацоўніцтва пазаштатных аўтараў, адкрываць сумесныя сайты ў Інтэрнеце, наладжваць творчыя конкурсы;

– устанаўлення добрых адносін з кіраўніцтвам раёнаў, на тэрыторыі якіх распаўсюджваецца ўплыў міжрэгіянальнай прэсы. Пажадана знаёміць іх з планамі работы, даваць слова на старонках сваіх газет. Цікавым і перспектыўным магло б стаць уключэнне выдаўцоў раённых СМІ ў састаў заснавальнікаў міжрэгіянальных газет. У сваю чаргу кіраўнікі дзяржаўных структур раёнаў маглі б запрашаць на свае нарады рэдактараў міжрэгіянальных СМІ, дасылаць у іх адрас афіцыйныя дакументы, матэрыялы для апублікавання, прапановы па ўключэнню ў планы работы рэдакцый асобных праблем, тэм. Гэта павысіла б аўтарытэт міжрэгіянальнай прэсы, кіраўнікоў раёнаў, садзейнічала кансалідацыі розных слаёў насельніцтва ў грамадстве, вырашэнню задач, што стаяць перад прэсай.